# Выстаўкі, прысвечаныя святу

У бібліятэках Мінска адкрыліся літаратурныя і фотавыстаўкі, прысвечаныя 4-й агадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Цікавая выстаўка арганізавана ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна. Тут каля 150 экспанатаў: кнігі, журналы, фотадакументы, якія расказваюць аб гераічнай барацьбе совецкага народа за свабоду і незалежнасць соцыялістычнай Айчыны. Шматлікія экспанаты прысвечаны правадыру і арганізатару перамог Совецкай Арміі таварышу Сталіну. Вялікую цікавасць прадстаўляе зборнік пісьмаў беларускіх партызан таварышу Сталіну.

Спецыяльны раздзел выстаўкі прысвечан аднаўленню і развіццю народнай гаспадаркі БССР.

У раздзеле «Вялікая Айчынная вайна ў мастацкай літаратуры» экспаніруюцца зборнікі вершаў Янкі Купалы, Аркадзія Куляшова, творы Міхася Лынькова, Кандрата Крапівы і другіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Літаратурная выстаўка, прысвечаная святу, адкрылася таксама ў абласной бібліятэцы імя Пушкіна. Фотавыстаўка аб аднаўленні народнай гаспадаркі БССР арганізавана ў бібліятэцы імя Горкага.

* * *

«Комсамол Беларусі ў тылу ворага» — так называецца выстаўка, якая адкрылася ў мінскім парку культуры і адпачынку імя Горкага. У шматлікіх экспанатах расказваецца аб слаўных справах маладых народных мсціўцаў. На адным са стэндаў змешчана карта дыслакацыі падпольных комсамольскіх арганізацый у час нямецка-фашысцкай акупацыі.